# ДЗЕЙНАСЦЬ ГЕНЕРАЛЬНАГА КОНСУЛЬСТВА ПОЛЬШЧЫ Ў МІНСКУ (1924–1938 гг.)

**В. М. Бароўская**

*Інстытут гісторыі НАН Беларусі,*
*вул. Акадэмічная 1, 220072 г. Мінск, Беларусь, borovskaya-olga@mail.ru*

У артыкуле звяртаецца ўвага на асноўныя накірункі дзейнасці Генеральнага консульства Польшчы ў Мінску ў 1924–1938 гг. Важнасць гэтага беларуска-польскага ўзаемадзеяння вызначалася наяўнасцю ў БССР польскай меншасці, гістарычнымі, эканамічнымі і культурнымі сувязямі з Польшчай, геапалітычным становішчам Савецкай Беларусі на савецка-польскім памежжы і шляху з СССР у Заходнюю Еўропу.

***Ключавыя словы***: Генеральнае консульства; Рыжскі мірны дагавор; консульская канвенцыя; пагадненне аб пагранічным чыгуначным руху.

# ACTIVITIES OF THE POLISH CONSULATE GENERAL IN MINSK (1924–1938)

**O. N. Borovskaya**

*The Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus,*
*Academic str. 1, 220072, Minsk, Belarus, borovskaya-olga@mail.ru*

The article draws attention to the main activities of the General Consulate of Poland in Minsk in 1924–1938. The importance of this interaction was determined by the presence of the Polish minority in the BSSR, as well as by historical, economic ties with Poland, the geopolitical position of Soviet-Polish border and the route from the USSR to Western Europe.

***Key words*:** Consulate General; Riga Peace Treaty; Consular Convention; Agreement on Border Rail traffic.

На этапе пераадолення непасрэдных наступстваў Першай сусветнай, грамадзянскай і польска-савецкай войн і вырашэння задач пасляваеннага аднаўлення шматразова ўзрастала неабходнасць сувязей БССР і Польшчы. Важнасць гэтага ўзаемадзеяння вызначалася наяўнасцю ў БССР польскай меншасці, гістарычнымі, эканамічнымі і культурнымі сувязямі з Польшчай, геапалітычным становішчам Савецкай Беларусі на савецка-польскім памежжы і шляху з СССР у Заходнюю Еўропу. У 1924 г. у Мінску было адчынена польскае консульства. Да стварэння консульства яго функцыі часткова выконвала аддзяленне Змешанай камісіі па рэпатрыяцыі. Нягледзячы на адсутнасць суседскага ўзаемадаверу, БССР і Польшча ўсё ж былі

вымушаны стварыць практычныя механізмы выканання дагаворных палажэнняў па мірным уладкаванні, арганізаваць рэпатрыяцыю шматлікіх ахвяр ваенных дзеянняў, развіваць дагаворна-прававую базу для вырашэння непазбежных памежных і міждзяржаўных праблем. Дзякуючы свайму геаграфічнаму становішчу і статусу ўдзельніка Рыжскага мірнага дагавора, БССР з'яўлялася выканаўцам (хоць і фармальным) шэрагу савецка-польскіх канвенцый, якія датычылі забеспячэння консульскіх паслуг, міжнародных, медыка-санітарных мерапрыемстваў, перамяшчэння асоб, грузаў, паштова-тэлеграфнай карэспандэнцыі.

Пытанне функцыянавання Генеральнага консульства Польшчы ў Мінску ў 1924–1938 гг. не станавілася аб'ектам самастойнага даследавання. У польскай гістарыяграфіі гэта праблема разглядаецца ў рамках вывучэння дзейнасці пасольства Польшчы ў Маскве [1–7]. У айчыннай гістарыяграфіі неабходна звярнуць увагу на артыкул А.Г. Цымбала [8]. Крыніцы па тэме часткова апублікаваны ў рамках зборніках дакументаў [9–11], часткова знаходзяцца ў сховішчах Архіва знешняй палітыкі Расійскай Федэрацыі, Архіва новых актаў у Варшаве (Archiwum akt nowych), Цэнтральнага вайсковага архіва (Centralny archiwum wojskowy). Нягледзячы на наяўнасці пэўных напрацовак па праблеме, існуе неабходнасць паглыбіць ступень вывучанасці пытання, выкарыстоўваючы раней не даступныя архіўныя дакументы. Мэта даследавання – ахарактыразаваць асноўныя накірункі дзейнасці Генеральнага консульства Польшчы ў Мінску з моманту яго адкрыцця ў 1924 г. і па 1938 г.

Пытанне аб арганізацыі польскага прадстаўніцтва ў БССР уздымалася ў лісце паверанага ў справах Польшчы ў РСФСР Р. Кноля віцэміністру замежных спраў Г. Страсбургеру 29 мая 1923 г. У ёй адзначалася аб неабходнасці рэканструявання польскіх рэпатрыяцыйна-аптацыйных агентстваў ў паўнамоцнае прадстаўніцтва ў Мінску [10, с. 271]. Аднак справа адкрыцця прадстаўніцтва Польшчы ў БССР было канчаткова вырашана толькі пасля стварэння СССР. 13 мая 1923 г. на нарадзе прадстаўнікоў саюзных рэспублік у Народным камісарыяце замежных спраў (НКЗС) РСФСР аб стварэнні СССР адзначалася, што ў сувязі са стварэннем СССР дзейнасць замежных місій у рэспубліках спыніцца да атрымання консуламі новых экзекватур ужо ад НКЗС СССР [11]. 31 жніўня 1923 г. ураду СССР быў накіраваны мемарандум міністра замежных спраў Польшчы М. Сейды, у якім змяшчаліся афіцыйныя ўмовы прыняцця да ведама ноты аб стварэнні СССР: Рыжскі дагавор, а таксама ўсе пагадненні і канвенцыі з урадамі РСФСР, УССР і БССР захоўваюць моц; у Харкаве, Тыфлісе і Мінску будуць адкрыты пры ўпаўнаважаных НКЗС СССР экспазітуры польскай місіі ў Маскве. 13 верасня 1923 г. Поль-

шча атрымала ў адказ ноту ўрада СССР, у якой польскія прапановы расцэньваліся як спроба перагляду Рыжскага дагавора, што магло выклікаць адпаведныя крокі па яго пераглядзе і з боку СССР. Пазіцыя Польшчы ў справе прызнання СССР змянілася са зменай міністра замежных спраў. 13 снежня польскі ўрад прыняў да ведама натыфікацыю аб стварэнні СССР. У ноце ў адказ СССР «у мэтах далейшага афармлення сяброўскіх адносін» прадставіў польскаму ўраду, незалежна ад падлягаючай заключэнню консульскай канвенцыі, права неадкладнага адкрыцця генеральнага консульстваў у Харкаве і Мінску і пагадзіўся на працяг тэрмінаў аптацыі польскага грамадзянства [10, с. 177].

Пасля зацвярджэння 6 ліпеня 1923 г. сесіяй ЦВК СССР «Дэкларацыі і Дагавора аб стварэнні СССР» у паўнамоцнае прадстаўніцтва БССР у Маскве быў накіраваны тэкст натыфікацыі аб уваходжанні БССР у склад СССР з даручэннем перадаць яго паўнамоцным прадстаўнікам Польшчы і Германіі, з якімі Беларусь знаходзіцца ў адносінах дэ-юрэ. Адпаведная нота была перададзена 16 ліпеня паверанаму ў справах Польшчы ў РСФСР Р. Кнолю. 21 ліпеня НКЗС БССР перадаў аналагічную ноту ў прадстаўніцтва польскай дэлегацыі ў Змешанай камісіі па рэпатрыяцыі. 12 верасня Старшыня ЦВК і СНК, народны камісар замежных спраў А. Р. Чарвякоў распаўсюдзіў заяву аб перадачы ўраду СССР паўнамоцтваў БССР на вядзенне ўсіх міжнародных спраў. З 15 верасня 1923 г. Паўнамоцнае прадстаўніцтва БССР пры ўрадзе СССР спыніла консульскую працу і перадало незавершаныя справы з НКЗС СССР [9, с. 72].

Перагаворы па заключэнні консульскай канвенцыі пачаліся ў Маскве 21 сакавіка 1924 г. Пацяпленне ў савецка-польскіх адносінах, якое пачалося пасля фарміравання ў снежні 1923 г. урада У. Грабскага, а таксама прызначэння новага пасла Л. Дароўскага ў Маскву, садзейнічала паспяховым перагаворам. Канвенцыя была падпісана 18 ліпеня 1924 г. [9, с. 106]. Прадугледжвалася, акрамя існуючых прадстаўніцтваў у Харкаве і Мінску, стварэнне консульстваў у Ленінградзе, Кіеве, Хабараўску і Тыфлісе. Для іх супрацоўнікаў ствараўся новы тып імунітэту. Канвенцыя набыла моц у красавіку 1926 г. Пры яе разглядзе ў польскім сейме частка дэпутатаў Беларускага пасольскага клуба выступіла супраць ратыфікацыі, разглядаючы яе як вынік Рыжскага міру. У гэтым жа годзе консульства ў Мінску было пераўтворана ў Генеральнае консульства (хоць беларускія ўлады называлі яго генеральным з самага пачатку). 25 сакавіка 1924 г. Я. Карчэўскі быў зацверджаны НКЗС СССР Генеральным консулам Польскай Рэспублікі ў г. Мінску з консульскай акругай на ўсю тэрыторыю БССР. 26 красавіка 1924 г. упаўнаважаны НКЗС пры ўрадзе БССР М.П. Ітві разаслаў паведамленне аб гэтым народным камісарыятам БССР з тлумачэннем, што Я. Карчэўскі мае права зносіцца праз упраўленне

ўпаўнаважанага НКЗС СССР з савецкімі ўстановамі па справах генконсульства; перапіска генконсульства, канцылярыя і архіў з'яўляюцца недатыкальнымі; генеральны консул мае ўсе правы ў адпаведнасці з дыпкарткай НКЗС. 18 лютага 1926 г. быў прыняты закон аб ратыфікацыі польскім сеймам консульскай канвенцыі паміж Польшчай і СССР [9, с. 105–106].

Консульства Польшчы ў Мінску інфармавала свае ўлады аб сітуацыі ў Савецкай Беларусі з ваеннага, палітычнага, сацыяльнага і эканамічнага пункту гледжання. У цэнтры ўвагі дыпламатычных работнікаў знаходзіўся савецкі друк, агляду якога надавалася значная ўвага, збіралася інфармацыя аб дзейнасці савецкіх дзяржаўных устаноў, вельмі значнай крыніцай інфармацыі былі асабістыя кантакты з грамадзянамі СССР. На падставе сабраных звестак даваўся аналіз працэсам, якія адбываліся ў БССР. Рыхтаваліся агляды прэсы, сітуацыйныя справаздачы і інфармацыйныя запіскі [12]. Большасць паведамленняў, якія захаваліся, датуюцца 1925 г., 1927 г., 1929 г., датычацца розных аспектаў палітычнай сітуацыі ў БССР, дзейнасці вядомых асоб беларускага руху і сувязей з Заходняй Беларуссю. Найбольш грунтоўнай справаздачай з'яўляецца «Сітуацыйная справаздача Генеральнага консульства Польшчы ў Мінску ад 4 лютага 1927 г.» [13].

У снежні 1928 г. упаўнаважаны НКЗС СССР пры ўрадзе БССР А.Ф. Ульянаў у лісце калегіі НКЗС СССР Б. Стаманякаву адзначаў спробы ўзмацнення кантактаў польскага генеральнага консула ў БССР Г. Янкоўскага з інтэлігенцыяй Беларусі (просьбы консула дазволіць азнаёміцца з дзейнасцю Беларускай акадэміі навук, Дзяржаўнага музея, бібіліятэкі) і лічыў неабходным ізаляваць консульства ад такіх кантактаў, абмежаваўшы іх афіцыйнымі [14]. Консульства ў Мінску працавала да канца 1930-х гг. У другой палове 1920-х гг. консулам быў Г. Янкоўскі, з 1930 г. яго змяніў Я. Гайдзінскі.

Па «Палажэнні аб дыпламатычных і консульскіх прадстаўніцтвах замежных дзяржаў на тэрыторыі СССР» 1925 г. консулы прызначаліся па ўзгадненні з урадам БССР. У жніўні 1937 г. былі зачынены генеральныя консульствы ў Тбілісі і Харкаве, у СССР прадстаўніцтвы Польшчы захоўваліся ў Мінску і Кіеве, консульства ў Ленінградзе і пасольства і Генеральнае консульства ў Маскве.

Асабовы склад Генеральнага консульства Польшчы ў Мінску налічваў 4–8 чалавек. З моманту адкрыцця консульства, яно займала другі паверх памяшкання па вуліцы Савецкая, 84 [15]. У «Адміністрацыйным рапарце Генеральнага консульства Польшчы ў Мінску за 1928 г.» В. Камянецкі, тагачасны консул, звяртаў увагу Міністэрства замежных спраў Польшчы на надзвычайную патрэбу ў выдзяленні памяшкання, большага

па памерах. Аднак шматлікія просьбы, накіраваныя да НКЗС СССР, не прыносілі пажаданых вынікаў [16].

Генеральны консул Польшчы ў Мінску займаўся справамі мясцовага польскага насельніцтва, выдачай выязных віз на тэрыторыю Польскай Рэспублікі, ажыццяўляў апеку над ваеннымі і грамадзянскімі пахаваннямі ў Савецкай Беларусі, аказваў матэрыяльную дапамогу мясцовым палякам. Вялікая ўвага была прысвечана апецы над палякамі, асуджаных за палітычныя злачынствы. У 1928 г. польскі консул ажыццяўляў апеку над 23 асобамі, якія знаходзіліся ў розных турмах БССР [17]. За 1928 г. з Мінска ў Варшаву было даслана 27 абшырных і падрабязных справаздач аб унутрыпалітычнай сітуацыі ў Савецкай Беларусі. Галоўным заданнем консульства з боку II аддзела Генеральнага штаба Войска Польскага да першай паловы 1928 г. быў аналіз мясцовай прэсы, а пазней збор данных аб ваенных аб’ектах, дыслакацыі войска і транспартнай камунікацыі. Супрацоўнікі консульства (напрыклад, ротмістр Г. Даліда-Дабравольскі) выязджалі па-за межы сталіцы з мэтай нагляду за пахаваннямі палякаў [18, k. 28–30]. У Мінску на базе Генеральнага консульства Польшчы ў Мінску з 1927–1930 гг. дзейнічала разведвальная пляцоўка «U–6», якая спыніла сваю працу ў выніку дэканспірацыі і па прычыне «нервовага вычарпання яе кіраўніка» [18, k. 31]. Галоўнай мэтай гэтай пляцоўкі стаў збор інфрамацыі аб ваенных вучэнняў Чырвонай Арміі ў раёне Бабруйска ў 1929 г. У іх прымалі ўдзел часткі Беларускага, Маскоўскага, Ленінградскага, Украінскага і Паўночна-Каўказскага ваенных акруг. Падчас іх былі ўпершыню выкарыстаны танкі і самалёты [18, k. 45].

У 1931–1935 гг. яе замяніла пляцоўка «B–17», арганізаваная пры аддзеле «Усход» польскага разведвальнага бюро. Яе кіраўніком з’яўляўся капітан Б. Ялавецкі, які адначасова выконваў абавязкі віцэ-консула [19]. Асноўнай формай яе дзейнасці быў кантроль над разведвальнымі пляцоўкамі на тэрыторыі БССР, нагляд і збор данных аб франтавых і тылавых абшарах Беларускай ваеннай акругі. Акрамя таго, агенты «B–17» павінны былі збіраць і накіроўваць у Варшаву экзэмпляры савецкай паперы, канвертаў, запалак, мужчынскага і жаночага аддзення [20]. Прычынай ліквідацыі «B–17» была аналагічная, што і мінулай. З 1935 г. па 1939 г. пры Генеральным консульстве Польшчы ў Мінску працавала разведвальная пляцоўка «L–19». Яе кіраўніком быў маёр Р. Пратасавіцкі, афіцыйны прадстаўнік консульства. Ажыццяўляла збор інфармацыі аб дыслакацыі частак Чырвонай Арміі ў БССР, камунікацыі, развіцця сельскай гаспадаркі і прамысловасці [21].

Усталяванне дыпламатычных адносін паміж Савецкай Беларуссю і Польскай Рэспублікай адбывалася праз дыпламатычных прадстаўнікоў

РСФСР шляхам арганізацыі двухбаковых сустрэч, абмену пасланняў і нот. Прадстаўніцтва Польшчы ў БССР ажыццяўлялася праз дзейнасць польскіх частак Змешаных камісій па рэпатрыяцыі, пагранічнай і спецыяльнай камісій, а з 1924 г. праз Генеральнае консульства ў Мінску. Сярод асноўных накірункаў дзейнасці консульства неабходна адзначыць не толькі вырашэнне справаў мясцовага польскага насельніцтва, выдачу выязных віз на тэрыторыю Польскай Рэспублікі, ажыццяўленне апекі над ваеннымі і грамадзянскімі пахаваннямі ў Савецкай Беларусі, аказанне матэрыяльнай дапамогі, але правядзенне інфармацыйна-разведвальнай дзейнасці на карысць Польскай дзяржавы.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. August Zaleski, minister spraw zagranicznych Rzeczypospolitej Polskiej (1926–1932) w świetle dokumentów i wspomnień. Warszawa, 1980.

2. *Balcerak W.* Sprawa białoruska a polityka odradzającej się Rzeczypospolite // Polska – Białoruś 1918–1945. Zbiór studiów i materiałów. Warszawa, 1994. S. 6–31.

3. *Deruga A.* Historia dyplomatyczna najnowsza XX wieku: w 5 cz. Warszawa, 1949–1952. Cz. 2: Od Wielkiej socjalistyczniej rewolucji październikowej do zawarcia paktów w Locarno (1917–1925). Warszawa, 1950.

4. Historia dyplomacji polskiej: w 7 t. / pod red. P. Łossowskiego. Warszawa : wydawnictwo naukowe PWN, 1995. T. 4: 1918–1939.

5. *Kornat M., Materski W.* Między pokojem a wojną. Szkice o dyplomacji polskiej lat 1918–1945. Warszawa, 2015.

6. *Kornat M.* Stanisław Patek i początki jego misji w Moskwie w r. 1927 (w świetle nowych dokumentów) // Zeszyty Historyczne. 2007. T. 539. S. 131–170.

7. *Róziewicz J.* Polsko-radzieckie stosunki naukowe w latach 1918–1939. Wrocław-Warszawa-Kraków-Gdańsk, 1979.

8. *Цымбал А. Г.* Палітычныя працэсы ў БССР у 1920–1930-я гг. у адлюстраванні паведамленняў дыпламатычных устаноў у СССР // Знакамітыя мінчане XIX–XX стст. Мінск і Міншчына пасля падзей 1921 года – лёсы людзей і краіны : матэрыялы X Міжнароднай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі (Мінск, 13–14 верасня 2016 г.). Мінск, 2017. С. 64–75.

9. Знешняя палітыка Беларусі : зборнік дакументаў і матэрыялаў : у 10 т. / склад. У. М. Міхнюк [і інш.], рэдкал.: І. І. Антановіч (старш.) [і інш.]. Т. 2: 1923-1927 гг. Мінск, 1999.

10. Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў (1914–1991 гг.) : зборнік дакументаў і матэрыялаў : у 4 т. Т. 2: 19 сакавіка 1921 г – 31 жніўня 1939 г. Мінск: Юніпак, 2008.

11. Документы и материалы по истории советско-польских отношений : в 11 т. / под ред. И. А. Хренов, Т. Цесляк. Т. 4 : апрель 1921 г. – май 1926 г. М., 1966.

12. Archiwum akt nowych. Sygn. 187. K. 1–7.

13. Archiwum akt nowych. Sygn. 150. K. 1–19.

14. Архіў знешняй палітыкі Расійскай Федэрацыі (АЗП РФ). Ф. 04. Воп. 32. П. 215. Спр. 52356. Арк. 19.

15. *Nowinowski S. M.* Specyfika funkcjonowania polskich placówek dyplomatycznych i konsularnych w Związku Sowieckim (1936–1939) // Z dziejów polskiej służby dyplomatycznej i konsularnej. Księga upamiętniająca życie i dzieło Jana Nowaka-Jeziorańskiego (1914–2005). Gorzów Wielkopolski, 2005. S. 17–21.

16. Archiwum akt nowych. MZS. Sygn. 11770. Raport administracyjny Konsulatu Generalnego RP w Mińsku za 1928 r.

17. *Skóra W.* Organizacja i działalność służby konsularnej Drugiej Rzeczypospolitej na terenach Rosji, Ukrainy i ZSRR w dwudziestoleciu międzywojennym (1918–1939) // Stosunki polityczne, wojskowe i gospodarcze Rzeczypospolitej Polskiej i Związku Radzieckiego w okresie międzywojennym / red. J. Gmitruk. Warszawa, 2012. S. 272.

18. Centralny archiwum wojskowy. Sygn. VIII. 800.71.5.

19. *Peploński A*. Wywiad polski na ZSRR 1921–1939. Warszawa, 2010.

20. Centralny archiwum wojskowy. Sygn. VIII. 800. 71.5. K. 31.

21. Centralny archiwum wojskowy. Sygn. VIII. 800. 71.4. K. 5–6, 12; 71.5. K. 32–36.